# Сумесны выпуск Беларусі і Расіі. Культурна-адукацыйны праект «Цягнік Памяці»

18 красавіка 2025 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Культурна-адукацыйны праект «Цягнік Памяці» з серыі «Сумесны выпуск Беларусі і Расіі».

Мастак Аляксандр Маскавец (Расія). Дызайн Яўгеніі Бядонік (Беларусь). Фота для канверта Першага дня Таццяны Уласенка.

Марка друкавалася ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

«Цягнік Памяці» – расійска-беларускі культурна-адукацыйны праект, накіраваны на аб'яднанне моладзі розных краін, фарміраванне паважлівых адносін і разумення значнасці гераічных подзвігаў нашых дзядоў і прадзедаў, знаёмства з культурай і традыцыямі суседніх дзяржаў.

Удзельнікі «Цягніка Памяці» адпраўляюцца ў падарожжа па маршруце, які ўключае наведванне гарадоў-герояў, мемарыяльных комплексаў, музеяў, месцаў баявой славы і іншых памятных месцаў.

«Цягнік Памяці» дапамагае захаваць сувязь пакаленняў, перадаючы эстафету памяці ад ветэранаў да маладых людзей, якія стануць захавальнікамі гэтай гісторыі ў будучыні.

Да паштовай маркі прымяняецца прыкладанне AR MARKA BELARUS.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска і ў Санкт-Пецярбургу будуць праводзіцца спецыяльныя гашэнні на канверце «Першы дзень».

Малюнак


Малюнак




**Source URL:**
*https://mpt.gov.by/sumesny-vypusk-belarusi-i-rasii-kulturna-adukacyyny-praekt-cyagnik-pamyaci*